сохранилась на протяжении веков и продолжает привлекать внимание людей со всего мира. Вода на Кавказе – это настоящее магическое лекарство, которое помогает сохранить здоровье и гармонию человека.

Литература:

1. Добровольский М. Ю. Вода – источник жизни и здоровья. [Электронный ресурс] / М. Ю. Добровольский. – Режим доступа: http://www.belkur.ru/sites/default/files/santekhnika_0.pdf. – Дата доступа: 01.10.2023.
2. Гуляев, С. А. Оздоровительные стоки Кавказа. [Электронный ресурс] / С. А. Гуляев. – Режим доступа https://www.rgtut.ru/poligon/guly/water.htm. – Дата доступа: 01.10.2023.
3. Болотин, Д. Ю. Питьевые горные минеральные воды Кавказа. Медицинская география [Электронный ресурс] / Д. Ю. Болотин, А. А. Ершова. – Режим доступа: http://www.medicinageo.ru/index.php/journal/article/view/113. – Дата доступа: 01.10.2023.
4. Г. Климов. Курорты Кавказа – Благословение для организма. [Электронный ресурс]. – Режим доступа https://royallib.com/read/klimov_evgeniy/kurorti_kavkaza_blagoslovenie_dlya_organizma.html. – Дата доступа: 01.10.2023.
5. Задорина, Н. А. Природные медицинские факторы Кавказа. Казанский медицинский журнал [Электронный ресурс] / Н. А. Задорина, Л. Ш. Халафян. – Режим доступа: https://www.kazanmedjournal.ru/journal-article/2018/rossiyskie-avtory/prirodnye-medicinskie-faktory-kavkaza/. – Дата доступа: 01.10.2023.

Репозиторий ГрГМУ

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І КУЛЬТУРА

## ВЕРШ “ПАКУЛЬ МАЛАДЫ” МІКОЛЫ АРОЧКІ ЯК МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ПОГЛЯДАЎ ПАКАЛЕННЯ “ШАСЦІДЗЯСЯТНІКАЎ”

**Богдан Л. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Тарасава С. М.

Знакавы след пакінула ў беларускай літаратуры пакаленне пісьменнікаў-“шасцідзясятнікаў”, якое сфарміравала адметныя гісторыка-культурныя і літаратурныя абставіны сярэдзіны XX ст. Невыпадкова за гэтым пакаленнем замацаваліся і іншыя назвы – “філалагічнае пакаленне”, пакаленне з апаленым вайной дзяцінствам. Пісьменнікі-“шасцідзясятнікі” Р. Барадулін, Н. Гілевіч, У. Караткевіч, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, Д. Бічэль-Загнетава, В. Зуёнак і інш. не толькі бачылі “новае” ў жыцці і літаратуры, але і прадэманстравалі ўнікальныя паэтычныя здольнасці ў выяўленні розных праяў рэчаіснасці.

Пра адметнасць беларускага “шасцідзясятніцтва” дакладна выказаўся М. Тычына, адзначыўшы, што *“на пачатку 60-х гадоў узнікла фенаменальная*

*з'ява, якая атрымала назву шасцідзясятніцтва. Творчы імпульс, атрыманы грамадствам у той час, быў такім моцным, што яго энергіі хапіла на наступныя тры дзесяцігоддзі. Два пакаленні беларускай інтэлігенцыі жылі верай у гуманістычныя каштоўнасці, чакалі змен у грамадскай атмасферы, выношвалі ілюзіі паступовага паляпшэння таталітарнай сістэмы, напаўнення сацыялістычнай ідэі чалавечым зместам"*[1].

Сярод пісьменнікаў-"шасцідзясятнікаў" вылучаецца асоба беларускага паэта Міколы Арочкі – паэта са Слонімшчыны, доктара філалагічных навук, крытыка і перакладчыка, аўтара кніг для дзяцей.

Спадчына М. Арочкі даволі аб'ёмная. Яна ўключае ў сябе вершаваныя зборнікі «Не ўсе лугі пакошаны» (1958), «Крылатае семя» (1967), «Кветкі бяссмертніка» (1972) і іншыя. Цікавай для чытачоў з'яўляецца кніга гумарыстычных вершаў для дзяцей "Рагуля на экскурсіі" (1962). Пісьменнік пакінуў пасля сябе шэраг літаратуразнаўчых прац: «Валянцін Таўлай» (1969), «Галоўная служба паэзіі» (1974) і іншыя. Як і ў іншых прадстаўнікоў "шасцідзясятніцтва", яго творчасць добра спалучыла ў сабе гістарычнае мінулае нашага народа і асабістае адчуванне жыцця, любоў да роднай старонкі і павагу да блізкіх людзей.

У 1958 годзе пабачыў свет першы зборнік М. Арочкі "Не ўсе лугі пакошаны". Ён падзелены самім аўтарам на дзве часткі: у першай творца паэтызуе незабыўны і непаўторны свет маленства, а ў другой пераважае аповед пра тое, што бачыць, адчувае паэт на новым этапе жыцця, больш сталым і неадназначным. Можна сцвярджаць, што ў вершах названага зборніка знайшлі адбітак асноўныя прынцыпы і прыярытэты пакалення "шасцідзясятнікаў".

Паказальным у гэтым плане з'яўляецца верш "Пакуль малады", якім пачынаецца першы зборнік паэта. У вершы дакладна адлюстравана творчае і жыццёвае крэда прадстаўніка новага літаратурнага пакалення. Галоўная тэма верша – паэтычнае асэнсаванне ролі паэта і паэзіі – пытанне, якое асабліва хвалявала маладых творцаў новага часу. Аўтар падае ў вершы свой роздум пра тое, як пражыць і як тварыць, каб пакінуць пасля сябе нешта знакавае. Лірычны герой катэгарычна адвяргае тыя рамкі, у якіх трэба трымаць неўтаймоўную творчасць: *"Дык чаго ж мне, скажыце, сядзець ды марудзіць? // Ногі просяцца ў далеч нязнаных дарог, // Свежасць ніў удыхнуць хочуць грудзі"* [2, с.5]. Ён сцвярдже, што найперш трэба вучыцца ў тых творцаў, якія могуць сваім прыкладам натхніць маладога пісьменніка да стварэння "гарачых радкоў". М. Арочка са скрухай згадвае ў вершы час, калі творчасць была загнана ў пэўныя рамкі. Адсюль, ён лічыць, і вынікае прычына, што юныя аўтары, такія, як і ён сам, "тапталіся" на сцежках паэзіі. Паэт не выпадкова параўноўвае сябе з коласам, сцвярджаючы: *"Не хачу між калоссяў быць коласам тым, // што часамі ўзрастае без зерня"* [2, с.6]. Гэтыя радкі можна без сумневу назваць ідэйным цэнтрам верша, бо ў іх выказана творчае крэда паэта: свой творчы шлях ён збіраецца прайсці адметна і непаўторна, пакінуўшы пасля сябе знакавы след.

Выяўленню галоўнай думкі ў вершы "Пакуль малады" спрыяе выкарыстанне адпаведных мастацкіх сродкаў. Эмацыйны фон у творы



Репозиторий ГрГМУ

ствараецца праз ацэначныя эпітэты: *“нязнаных дарог”, “гарачых радкоў”, “буйным зернем”*, якія адназначна падкрэсліваюць няўрымслівасць асобы самога творцы.

Увасабленні ў дадзеным вершы дапамагаюць нам адчуць усю прагу лірычнага героя да адкрыцця новага. Напрыклад, *“ногі просяцца ў далеч…”, “свежасць ніў удыхнуць хочуць грудзі.”* Ужыванне такога ж мастацкага тропа мы бачым і ў фінале верша, у звароце да роднага краю : *“Родны край! Налівай.. Красуй, каласуй…Павер мне…”* Перадачы ўзрушанага пачуцця лірычнага героя спрыяюць сродкі паэтычнага сінтаксісу – воклічы, умаўчанне, рытарычныя пытанні.

Верш “Пакуль малады” сведчыць аб сапраўдным майстэрстве паэта адчуваць людзей і жыццё навокал. І хоць гэты верш з’яўляецца адным з самых “маладых” у творчасці пісьменніка, але ў ім мы ўжо можам заўважыць праявы індывідуальнага мастацкага стылю.

У многіх вершах зборніка М. Арочкі “Не ўсе лугі пакошаны” дакладна праявілі сябе рысы, характэрныя для ўсяго творчага пакалення “шасцідзясятнікаў” – узрушанасць перажыванняў, рамантычнасць, прага новага, светлага ў жыцці, прага творчай свабоды для кожнага чалавека. У той жа час вылучыліся і адзнакі індывідуальнага стылю – роздумнасць, лірычная спавядальнасць, асаблівы рытміка-інтанацыйны склад вершаў.

Літаратура:

1. Тычына, М. Уладзімір Калеснік і “шасцідзясятнікі” / М. Тычына // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: – https://www.brsu.by/kalesnik/uladzimir-kalesnik-i-shastsidzesyatniki. – Дата доступу: 10.03.2023.
2. Арочка, М. Не ўсе лугі пакошаны: вершы, паэма / М. Арочка. – Мінск, 1958. – 62 с.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ГУЛЬНЯВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАМПАНЕНТАМ ЯК СРОДАК ПАВЫШЭННЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

**Казыра А. В.**

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Лапкоўская А. М.

Сучасная адукацыйная прастора не ўяўляецца без выкарыстання гульнявых тэхналогій з нацыянальным кампанентам выкладання, якія маюць шырокія магчымасці рэалізацыі мэтаў навучання і выхавання. Побач з традыцыйнымі формамі яны дазваляюць якасна вырашаць псіхолага-педагагічныя задачы, хутка задавальняюць патрэбы ў новых арганізацыйных формах, разам з гэтым развіваюць уменні самастойнай работы вучняў,

Рэпазіторый ГрДУ